


# *ПАДАРОЖЖА З АЛФАВІТАМ*

**Член СПБ, вядомая беларуская паэтэса, публіцыст Тамара Мазур (Гродзенскі раён) стала аўтарам сваёй першай кнігі для дзяцей. Выданне «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі»** ***(Мінск, «Ковчег», 2024)*** **прынесла пісьменніцы перамогу ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча.**

Кніга «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» запрашае маленькіх чытачоў у цікавае падарожжа разам з беларускім алфавітам. Кожная літара – гэта пэўны прыпынак, на якім адбываецца знаёмства з новымі беларускімі словамі ці замацаванне ведаў аб вядомых. Выданне адрасуецца дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Паслужыць дапаможнікам для выхавальнікаў дзіцячых садкоў і лагапедаў паспрыяе вывучэнню беларускай мовы на індывідуальных і групавых занятках у гульнёвай форме.

***Анатацыя***

***

Першая кніга для дзіцячай чытацкай аўдыторыі ад вядомай беларускай пісьменніцы з Гродзеншчыны Тамары Міхайлаўны Мазур багата аздоблена каляровымі ілюстрацыямі (іх аўтар – *мастачка Анастасія Ценкуш*). Падзагаловак у кнігі – «Чытанка з міні-маляванкай», – яна вучыць чытаць праз маляванне ды цікавую гульню ў падарожжа па свеце літар і слоў. «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» насамрэч можна назваць арыгінальным літаратурна-мастацкім падручнікам па роднай мове для самых маленькіх беларусаў. Такіх карысных, універсальных кніг айчынная дзіцячая літаратура яшчэ не ведала. Тое, што выданне прынесла яго аўтару перамогу ў прэстыжным літаратурным спаборніцтве, абсалютна заканамерна. У кнізе 36 старонак, пераплёт мяккі. Наклад 99 асобнікаў. У аўтарскім рэдагаванні. Паліграфія: *ТАА «Ковчег»*, г. Мінск.